______________________________________________

(miestas / rajonas, mokykla)

__________ klasės mokinio (-ės) ______________________________

(vardas ir pavardė)

# GIMTOJI KALBA (BALTARUSIŲ)

2016 m. mokyklinio brandos egzamino užduotis

Pagrindinė sesija

**2016 m. birželio 22 d.** **Trukmė – 4 val. (240 min.)**

**NURODYMAI**

- Pasitikrinkite, ar egzamino užduočių sąsiuvinyje nėra tuščių lapų ar kito aiškiai matomo spausdinimo broko. Pastebėję praneškite egzamino vykdytojui.
- Antraštiniame lape užrašykite savo vardą ir pavardę, rajoną / miestą, mokyklą ir klasę (grupę).
- Vertinami tik tie atsakymai, kurie parašyti mėlynai rašančiu rašikliu. Koregavimo priemonėmis naudotis negalima. Neaiškiai parašyti, pribraukyti atsakymai vertinami 0 taškų.
- Atlikdami teksto suvokimo užduotis (II egzamino dalis), į klausimus atsakykite glaustai ir aiškiai. Jūsų atsakymai turi tilpti paliktose eilutėse.
- III egzamino dalyje pateiktos trys rašinio temos ir du tekstai interpretacijai. Įdėmiai juos perskaitykite, pasirinkite ir parašykite vieną rašinį arba vieną teksto interpretaciją.
- Turite parašyti 250–400 žodžių (A4 formato 1–2 puslapiai) tekstą. Vertinant bus atsižvelgiama ir į darbo apimtį. Švarraštyje suskaičiuokite žodžius. Paraštėje **nurodykite 250 žodžių ribą**.
- Jeigu pirmiausia rašote juodraštyje, pasilikite pakankamai laiko darbui perrašyti į švarraštį. **Juodraštis nebus tikrinamas.**

Linkime sėkmės!

**EGZAMINO VERTINIMAS TAŠKAIS**

| **II dalis (teksto suvokimas)** | **III dalis (teksto kūrimas)** | **TAŠKŲ SUMA** |
|---|---|---|
| 30 taškų | 40 taškų | 70 taškų |
| | | |

Vertinimo komisija: ______________________________

(parašas, vardas ir pavardė)

______________________________

(parašas, vardas ir pavardė)

______________________________

(parašas, vardas ir pavardė)

© Nacionalinis egzaminų centras, 2016

# II egzamino dalis

# TEKSTO SUVOKIMAS

**Прачытайце тэкст і выканайце змешчаныя пасля яго заданні.**

Мой родны кут, як ты мне мілы!
Забыць цябе не маю сілы!
Не раз, утомлены дарогай,
Жыццём вясны мае убогай,
К табе я ў думках залятаю
І там душою спачываю.
О, як бы я хацеў спачатку
Дарогу жыцця па парадку
Прайсці яшчэ раз, азірнуцца,
Сабраць з дарог каменні тыя,
Што губяць сілы маладыя, –
К вясне б маёй хацеў вярнуцца.

Вясна, вясна! не для мяне ты!
Не я, табою абагрэты,
Прыход твой радасны спаткаю, –
Цябе навек, вясна, хаваю.
Назад не прыйдзе хваля тая,
Што з быстрай рэчкай уплывае.
Не раз яна, зрабіўшысь парам,
На крыллях сонца дойдзе к хмарам
Ды йзноў дажджом на рэчку сыдзе –
Ніхто з граніц сваіх не выйдзе,
З законаў, жыццем напісаных,
Або на дол спадзе ў туманах.
Але хто нам яе пакажа?
На дол вадой ці снегам ляжа?
Не вернешся, як хваля тая,
Ка мне, вясна ты маладая!..

(Я. Колас. *Новая зямля*)

***Заданні да тэксту*** *(30 балаў)*

Балы: I II III

**1.** “Новая зямля” – гэта твор: *(Правільны адказ абвядзіце)*

А. Эпічны
Б. Лірычны
В. Ліра-эпічны
Г. Драматычны

*(1 бал)*

**2.** Растлумачце асаблівасці гэтага жанру.

______________________________
______________________________
______________________________

*(2 балы)*

**3.** Галоўная тэма твора: *(Правільны адказ абвядзіце)*

А. Паказ жыцця лесніка.
Б. Любоў да Радзімы.
В. Замілаванасць прыродай.
Г. Паказ жыцця селяніна.

*(1 бал)*

**4.** Вызначце тэму ўрыўка.

______________________________
______________________________

*(1 бал)*

**5.** Чаму гэты ўрывак мы называем лірычным адступленнем?

______________________________
______________________________
______________________________

*(2 балы)*

**6.** Вызначце настрой урыўка.

______________________________
______________________________

*(1 бал)*

**7.** Якія радкі твора тлумачаць такі настрой?

______________________________
______________________________

*(1 бал)*

| Сума балаў за заданні 1–7 *(макс. 9 балаў)* | | | |
|---|---|---|---|

*Балы* I II III

**8.** Растлумачце значэнне тэрміна “лірычны суб'ект”.

(*2 балы*)

**9.** Якім вам уяўляецца лірычны суб'ект гэтага ўрыўка?

(*2 балы*)

**10.** Аб чым марыць лірычны суб’ект? *Адкажыце словамі тэксту.*

(*1 бал*)

**11.** Чаму ў складаныя хвіліны жыцця лірычны суб'ект звяртаецца ў думках да роднага кута? *Адкажыце словамі тэксту.*

(*1 бал*)

**12.** Растлумачце сэнс слова *каменні* ў выразе *каменні тыя, што губяць сілы маладыя.*

(*2 балы*)

**13.** У якім сэнсе ўжыта слова *вясна* ў радку *Жыццём вясны маей убогай*?

(*1 бал*)

**14.** Растлумачце сэнс сказа *Цябе навек, вясна, хаваю.*

(*1 бал*)

| | | | |
|---|---|---|---|
| Сума балаў за заданні 8–14 (*макс. 10 балаў*) | | | |

| Балы | | |
|---|---|---|
| I | II | III |

**15.** Да слова *вясна* падбярыце:

эпітэт – ______________________________

метафару – ______________________________

параўнанне – ______________________________

*(3 балы)* ___ ___ ___

**16.** Назавіце 4 прозвішчы пісьменнікаў, якія, як і Я. Колас, прыйшлі ў беларускую літаратуру ў пачатку XX ст.

______________________________

______________________________

*(2 балы)* ___ ___ ___

**17.** Падбярыце 4 сінонімы да слова *дарога*.

______________________________

______________________________

*(2 балы)* ___ ___ ___

**18.** Ад наступных слоў утварыце і запішыце формы роднага склону множнага ліку:

*жыццё* – ______________________

*кут* – ______________________

*на крыллях* – ______________________

*хваля* – ______________________

*(2 балы)* ___ ___ ___

**19.** Там, дзе магчыма, утварыце ад прыметнікаў простую форму вышэйшай ступені параўнання.

*Быстры* – ______________________

*Убогі* – ______________________

*Малады* – ______________________

*Добры* – ______________________

*Сонны* – ______________________

*Дрэнны* – ______________________

*(2 балы)* ___ ___ ___

| Сума балаў за заданні 15–19 *(макс. 11 балаў)* | | | |
|---|---|---|---|

АЦЭНКА ВЫКАНАННЯ ТЭСТА

| | | Члены камісіі | | |
|---|---|---|---|---|
| | Макс. сума | 1 | 2 | 3 |
| Сума балаў за заданні 1–7 | 9 | | | |
| Сума балаў за заданні 8–14 | 10 | | | |
| Сума балаў за заданні 15–19 | 11 | | | |
| Сума балаў | 30 | | | |
| Акругленая сума балаў | 30 | | | |

# III egzamino dalis

# TEKSTO KŪRIMAS

З прапанаваных тэм сачыненняў і тэкстаў для інтэрпрэтацыі Вы павінны выбраць адну тэму альбо адзін тэкст і напісаць працу. Праца павінна быць аб’ёмам прыблізна 2 старонкі фармата А4 (250–400 слоў). У чыставіку ад пачатку працы адлічыце 250 слоў, пазначце месца, дзе яны заканчваюцца, і запішыце гэтую колькасць на палях.

## ТЭМЫ САЧЫНЕННЯЎ

**1.** Пошукі чалавекам сэнсу жыцця (па творах беларускіх пісьменнікаў).

**2.** Фальклорныя матывы ў беларускай літаратуры.

**3.** Тэма роднага кута, “малой радзімы” ў беларускай літаратуры.

## ТЭКСТЫ ДЛЯ ІНТЭРПРЭТАЦЫІ

**4. Пімен Панчанка**

Той дзень прапаў і страчаны навекі,
Калі ты не зрабіў таго, што мог;
Калі не паспрыяў ты чалавеку,
Няшчыры быў, зманіў, не дапамог.

Той дзень збяднеў, зліняў на сотню радуг
І, попелам пасыпаны, сканаў,
Калі не падзяліў з суседам радасць
І больш за дзень узяў ты, чым аддаў.

Той дзень, лічы, завянуў пустацветам,
Калі ты пяць хвілін пашкадаваў,
Каб дзецям паказаць кусочак свету
І хараство людзей, і дрэў, і траў.

Той дзень зусім закрэслены табою,
Калі ты раўнадушна абмінуў
Бяду чужую, пабаяўся болю,
Абразу хама моўчкі праглынуў...

Пазней старэць пачнеш самотна ў хаце
І будзеш скаргі гнеўна кідаць нам.
Не мы, жыццё табе даўгі заплаціць
За раўнадушша.
Вінаваты сам.

Мы не плюём на дружбу і на працу:
Нам без трывог не зберагчы жыцця.
Сябры, давайце будзем хваляваца
За ўсіх і ўсё: за зерне і дзіця...

Я не святы, хоць і не сквапны злыдзень.
Даруйце, калі часам быў глухі
Ці чалавека грубасцю пакрыўдзіў...
Грахі мае, бясконцыя грахі.

**5. Максім Гарэцкі**

**Ціхая плынь**
(урывак)

Сонца борзда закоціцца, а дзеці ўздумалі “пірагі” пячы. Накапалі ў ямачцы гліны, у чарапочку замясілі і на ўслончыку наляпілі шмат вялікіх і маленькіх “пірагоў”, на сонейку, дзе будуць яны пячыся. Дзяўчынкам прыкра, што ў бабскую справу ўбіўся хлопчык. Ён не лепіць вялікіх і невялічкіх піражкоў, як тое вядзецца ў добрай гаспадыні, а пачынае галузавацъ, ляпіць ні то конікаў, ні то цюцек. І дзяўчаткі ўсякім спосабам псуюць яму работу.

Ах, гэтыя перашкоды ў вольнай творчасці паэта ў лепшую пару яго жыцця, пару маленства!

Пара, на якую не варта забывацца. Хто счарсцвеў, пагінуў у будзёншчыне – у дзіцячыя гады быў вялікім музыкаю, граючы на скрыпачцы з лучынак і са струнамі з нітак. І даўлела яму, быў змысел і была радасць. Хто зрабіўся тупы, як палка, – у гады маленства з палкі выпрабляў мастацкія для яго мастацкіх пачуванняў штукі: птушачак, звяроў і прост харошы кіёчак-папірашку. Надышлі гады жыццёвага амбарасу і бясконцага дурнога клопату – і знішчылі творчую радасць, растапталі дыямант у пабітым шкле, з паэта зрабілі быдліну.

Жыццё, жыццё! Мы ўсе прыходзім на свет хто песняром, хто разьбяром, а хто і тым і сім патроху. Мы ўсе ў гады прачнавання нашага розуму – рэфарматары нягоднага старога, будаўнікі лепшай сацыяльнасці, славутыя настаўнікі ці добрыя разбойнікі, але часта-часта жыццё нічагусенькі не пакідае нам і робіць жаласнымі старцамі без пары.

1930 г.

ЧАРНАВІК

***Працяг чарнавіка на 10-й старонцы***

ЧЫСТАВІК

*I* *II* *III*

***Працяг чыставіка на 11-й старонцы***

***Працяг чарнавіка***

***Працяг чарнавіка на 12-й старонцы***

*Працяг чыставіка*

*I II III*

*Працяг чыставіка на 13-й старонцы*

*Працяг чарнавіка*

*Працяг чарнавіка на 14-й старонцы*

*Працяг чыставіка*

*I* *II* *III*

*Працяг чыставіка на 15-й старонцы*

*Працяг чарнавіка*

***Працяг чыставіка***

*I II III*

| III dalis (teksto kūrimas) | | | | Сума балаў |
|---|---|---|---|---|
| **Змест** | **Структура тэксту** | **Стыль мовы** | **Грамат-насць** | |
| 20 балаў | 4 балы | 4 балы. | 12 балаў | 40 балаў |
| | | | | |